УДК 94(476) / 19

# РОЛЯ ШЛЯХЕЦКІХ СЯДЗІБАЎ ГРОДЗЕНШЧЫ Ў РАЗВІЦЦІ ТУРЫЗМУ Ў МІЖВАЕННЫ ЧАС

**С.У. Словік, І.Ф.Скварнюк**

Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы, slov_svet@rambler.ru, skvarniuk@94tut.by

Турыстычная дзейнасць шляхецкіх сядзібаў на тэрыторыі сучаснай Гродзеншчыны ў міжваенны час была адным з накірункам эканамічнай дзейнасці іх гаспадароў. Землі Панёмання аказаліся ў складзе II Рэчы Паспалітай паводле Рыжскай дамовы з 1921 па 1939 гады. Гродзеншчына з'яўлялася часткай Беластоцкага ваяводства. У дадзены перыяд шляхетскія маёнткі перажывалі эканамічны крызіс, так як выробленая прадукцыя давала невялікі даход, але патрабавала значных капілаўкладанняў. Адбываўся працэс разарэння гаспадаркі і ў 1930–х гадах амаль 90% маёнткаў сталі ўласнасцю дзяржавы [1, с. 45]. Частка уладальнікаў сядзібаў, што здолелі выплаціць усе падаткі і выратавацца ад эканамічнага развалу , выкарыстоўвалі любую магчымасць для фінансавання і ўтрымання гаспадакі, уласнай сям'і. Таму выкарыстанне шляхецкага дому ў якасці міні атэля і прадастаўленне пэўных паслугаў для наведвальнікаў стала вельмі актуальным вырашэннем стану гаспадаркі. Тым болей, што праца па уладкаванню гасцей і арганізацыя іх адпачынку не патрабавала фізічнай сілы, вялікіх капіталаўкладанняў і асобнай прафесійнай падрыхтоўкі.

Магчыма таму, за арганізацыю турыстычнай дзейнасці ўласнай сядзібы ўпершыню ўзялася жанчына – пані дому. Яна цудоўна ведала усё тое, што датычыла структуры ўладкавання самой сядзібы – функцыі пакояў, кіраванне прыслугай, сітуацыю на кухні, урэшце–рэшт валодала дыпламатычнасцю, тактам, гнуткасццю і інфармацыяй аб навакольным асяродзі. Тым болей, што такая сітуацыя супала з зацікаўленнем землямі Гродзеншчыны прадстаўнікамі польскай арыстакратыі. Прыгожыя краявіды, добрае паветра, шматлікія лясы, якіх у Польшчы амаль няма, танныя кошты прыцягвалі ўвагу турыстаў з Захаду. Для пашэрэння інфармацыі аб магчымасцях адпачынку на ўлонні прыроды зямель Паномання штогод у Варшаве выходзіў спецыяльны буклет пад назваю "Лета ў сядзібах на Усходніх Землях". Заснавальнікам выдавецтва было Таварыства развіцця Усходніх Зямель. Мэты арганізацыі былі розныя, але асноўныя функцыі – азнаямленне жыхароў этнічнай Польшчы з землямі, далучанымі ў міжваенны час. [2, с. 5]. Штогоднік уяўляў сабой своеасаблівую рэкламную прадукцыю аб турыстычных магчымасцях Гродзеншчыны. Вось што было напісана ў адным з нумароў буклета за 1938 год: "…абшар Усходніх Зямель мае ідэальныя ўмовы для адпачынку. Густая сетка рэкаў і азёраў, багатыя ягадамі і грыбамі лясы, непасрэдны кантакт з некранутаю прыродаю даюць магчымасць паправіць свій псіхалагічны стан, выдатна адпачыць і пазнаць духоўныя краявіды Зямель Усходу пры нізкіх коштах". [2, с. ]. Такім чынам, шляхецкія сядзібы Гродзешчыны сталі актуальным месцам адпачынку ў міжваенны час, так як мелі некаторыя перавагі перад падомнымі ўмовамі на землях этнічнай Польшчы: танны кошт, лес, духоўная зацікаўленнасць. Трэба сказаць, што такі адпачынак стаў карыстацца вялікім попытам. Таму ў 1938 годзе Таварыствам развіцця Усходніх Зямель разам з Лігай дапамогі турызму, была распрацавана цэлая праграма для турыстаў, якія жадалі адпачыць на Усходзе. [3, с. 17]. У першую чаргу былі зробленмы мапы Усходніх Зямель, дзе пазначылі ўсходнюю частку Беластосцага (Гродзеншчыну), цалкам Віленскае, Навагрудскае, паўночную частку Валынскага ваяводстваў разам з сядзібамі, якія прадстаўлялі турыстычныя паслугі. Асоба, якая набывала такую мапу, адначасова мела магчымасць купіць спецыяльны ільготны білет, які складаў 50 % ад агульнай сумы, на праезд па чыгунцы ў абодва бакі ў пазначаныя вышэй ваяводствы. Работа мела двухбаковы характар. Дадзенае Таварыства працавала і з гаспадарамі сядзібаў, прычым з больш заможнымі і надзейнымі ў эканамічным стане. Уладальнікам неабходна было запоўніць спецыяльныя анкеты, дзе змяшчалася пэўная турыстычная інфармацыя. Пасля некаторай апрацоўкі і адбору па маёмаснаму крытэрыю, развіццю гаспадарскай інфраструктуры, адлегласці да чыгункі і іншых умовах, дадзеная інфармацыя друкавалася ў штогодніку "Лета ў сядзібах на Усходніх Землях". Усю адказнасць за дакладнасць інфармацыі бралі на сябе гаспадары маёнткаў. Пры неадпаведнасці інфармацыі для гаспадароў ніякіх наступстваў не было, але на наступны год такая сядзіба не трапляла ў штогоднік. Дзейнічала рыначная канкурэнцыя, што прыводзіла да якаснага абслугоўвання турыстаў, адказвала за якую гаспадыня і абслуга маёнтка.

Прааналізаваўшы штогоднік "Лета ў сядзібах на Усходніх Землях" бачна, што найбольшу чатску складаюць маёнткі Гродзеншчыны, якія знаходзіліся недалека Аўгустоўскага канала. Больш таго, апісанне сядзібаў дае каштоўную інфармацыю аб даваеннай турыстычнай інфраструктуры,

Полесгу

аб відах адпачынку і  форму арганізацыі.  На 1938 год у штогодніку Беластоцкае ваяводства, куды ўваходзіла Гродзеншчына, прадствіла шэсць сядзібаў, якія так ці іначай знаходзіліся ў раёне Аўгустоўскага каналу.  Усе яны мелі аднолькавую структуру і форму падачы інфармацыі, якая выглядала наступным чынам:

**“Сядзіба Свяцк Гурскіх** – прапаноўвае адпачынак ад 14 мая да 1 кастрычніка. Маёнтак, уладальнік Юзаф Гурскі, пошта ў Сапоцкіна, Аўгустоскі павет, чыгуначная станцыя ў Гродна. Ад пляца Ст. Баторыя ў Гродна курсіруе  аўтобус да Сапоцкіна (25 км), адкуль 4 км даезд коньмі. Аўтобус з Гродна адыходзіць а 7–й гадзіне раніцы, а 13–й гадзіне ў абед, а 17–й і 18–й гадзінах вечара. Пошта, тэлеграф, тэлефон у Сапоцкіна, там жа касцёл, аптэка і лекар. Мясцовасць пагоркавая. Лес злучаецца з паркам. Глеба пясчаная. Мясцовасць са здаровым паветрам. Асвятленне сядзібы нафтавае і часткова электрычнае. Ёсць каналізацыя, вадаправод, ванны пакой.  Магчымасці адпачынку: тэніс, лодка, прагулкі брычкай ці аднаколкай за дадатковую плату, бібліятэка, радыё і два фартэпіяна. Збор грыбоў і ягадаў. Паляванне на качак за дробную плату. Катанне на лодках па Аўгустоўскаму каналу ці на цеаплаходзе “Эміліі Плятар”. Магчымасці экскурсійныя: экскурсія на канал Аўгустоўскі (2 км), на Нёман (4 км), у Аўгустоўскія лясы (4 км), аўтобусам да Аўгустова і Сувалак, на возеоа Вігры. Памяшканне ў двары і афіцыне. Пакоі 1, 2 і 3–асабовыя. Харчаванне 4 разы на дзень. Аплата ад асобы 4 злотых штодзень. Дзеці да 7–мі гадоў плацяць 2 злотых, да 10–ці – 3 злотых, дзеці, якія маюць менш як 3 гады не прыймаюцца. Аплата ў двары на 25 злотых дара;эй, чым у афіцыне. У маі, чэрвені і верасні плаціцца на 50 грошай танней. ”. [4, с. 115].

Такім чынам, у міжваенны час на тэрыторыі Гродзеншчыны дастакова актыўна развівалася турыстычная дзейнасць ў шляхецкіх сядзібах. Менавіта яны першымі заняліся дзейнасцю па забяспячэннюю турыстычнымі паслугамі гасцей Панёмання. Як бачна, рабілі гэта прафесійна, так як праводзілася і маркетынгавая палітыка, меўся дыферанцаваны падыход да турыстаў, прапаноўваліся паслугі, няхай і простыя, але адпавядалі канцэпцыі адпачынка.

Полесгу

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Kacprzak, M. Towarzystwo Rozwoju Ziem Wschodnich, 1933–1939 / M. Kacprzak.  – Łódź: Wudawnictwo Naukowe «Ibidem»,  2005. – 158 s.

2. Statut Towarzystwa Rozwoju Ziem Wschodnich. – Warszawa : Nakladem Towarzystwa Rozwoju Ziem Wschodnich, 1938. – 16 s.

3. Informator turystyczny. – Warszawa : Nakladem Związku Polskich Towarzystw Turystycznych w Polsce, 1932. – 265 s.

4. Rocznik Ziem Wschodnich / pod. red. E. Ruhlego. – Warszawa: Wudawnictwo zarządu głównego Tow. Rozwoju Ziem Wschodnich, 1938, – 265 s.